# Арганізцыя самастойнай працы вучняў на этапе замацавання ведаў, уменя і навыкаў на ўроках беларускай мовы ў пачатковых класах

*Савікава Ганна Юр'еўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Падбіраючы самастойную работу для вучня, настаўнік павінен ведаць, што поспех яе залежыць ад таго, наколькі грунтоўна прадуманы такія пытанні, як прызначэнне прапануемай работы, яе адпаведнасць тэме ўрока, даступнасць і пасільнасць, што карыснага дасць гэта работа, чаму навучыць дзяцей, да якіх прывядзе вынікаў, чым можа зацікавіць вучняў, якія практычныя навыкі набудуць яны і іншыя, што дапамагаюць паспяхова ажыццяўляць сувязь навучання з жыццём, зліваць у адзіным патоку навучанне і выхаванне дзяцей.

Арганізуючы самастойную работу школьнікаў, настаўнік павінен кіравацца наступнымі меркаваннямі: 1) самастойную работу трэба дакладна разлічваць у часе: яе працягласць на кожным этапе ўрока не павінна перавышаць 5–10 хвілін; 2) да выканання самастойнай работы вучняў патрэбна грунтоўна рыхтаваць: яны павінны добра ўсведамляць, што і як трэба рабіць; 3) апрача агульных заданняў для ўсяго класа, неабходна падбіраць індывідуальныя заданні для слабых і моцных вучняў; 4) кожную самастойную работу абавязкова трэба правяраць; 5) пры арганізацыі самастойнай работы шырока выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі навучання; 6) нельга з дапамогай самастойнай работы перакладаць вывучэнне праграмнага матэрыялу на плечы саміх вучняў [1, 54].

Самастойная работа павінна выкарвстоўвацца толькі для замацавання і паўтарэння матэрыялу, вывучанага пры непасрэдным удзеле настаўніка. У залежнасці ад зместу і задачы ўрока самастойная работа вучняў у класе павінна мець вучэбны і кантрольны характар і вырашаць галоўным чынам наступныя тры асноўныя задачы: 1) падрыхтаваць вучняў да тлумачэння матэрыялу па мове. Самастойная работа, якая мае на мэце падрыхтоўку дзяцей для тлумачэння новага матэрыялу па граматыцы або правапісу, даецца тады, калі настаўніку неабходны канкрэтныя прыклады або словы, на аснове якіх будуць раскрывацца пэўныя законы і правілы граматыкі; 2) замацаваць растлумачаны матэрыял, гэта значыць вучыць дзяцей самастойна набываць патрэбныя веды па падручніку. Самастойная работа па замацаванні даюцца вучням пасля разбору з настаўнікам граматычнага матэрыялу. Гэтыя самастойныя работы павінны дапамагаць вучням выпрацоўваць уменне выкарыстоўваць на практыцы растлумачаныя законы або правілы граматыкі, навыкі распазнавання вывучаемых

граматычных прымет часцін мовы, сказаў; 3) праверыць веды дзяцей па матэрыяле папярэдняга ўрока або ўсёй тэмы. Самастойныя работы, якія маюць кантрольны характар, праводзяцца ў мэтах уліку ведаў дзяцей. Характар гэтых работ павінен быць такім, каб яны давалі магчымасць настаўніку праверыць, як дзеці засвоілі і разумеюць канкрэтныя законы і правілы граматыкі, як умеюць выкарыстоўваць іх у практыцы сваёй вуснай і пісьмовай мовы, як цверда замацаваліся арфаграфічныя і пунктуацыйныя навыкі [1, 65].

А зараз больш канкрэтна разгледзім самастойную работу вучняў на ўроках беларускай мовы на этапе замацавання матэрыялу, на этапе яго паўтарэння, на этапе фарміравання ўменняў і навыкаў, на этапе дамашняга задання.

Замацаванне ведаў, уменняў і навыкаў надаецца ў пачатковых класах вялікае значэнне: вучыцца на ўроках – адзін з асноўных прынцыпаў работы ў сучаснай школе. Для таго, каб упэўніць, што вучні зразумелі матэрыял, выкарыстоўваюцца розныя прыемы па замацаванні пройдзенага матэрыялу. З дыдактычнага пункту гледжання ўрокі замацавання павінны навучыць дзяцей выкарыстоўваць атрыманыя веды ў нестандартных умовах пры выкананні разнастайных, творчых па сваёй сутнасці практыкаванняў. На ўроку неабходна змяняць формы і віды самастойнай дзейнасці, падбіраць цікавы дыдактычны матэрыял.

Замацаванне нпйбольш эфектыўнае, калі яно складаецца з наступных элементаў: а) праверкі засваення тэарэтычнага матэрыялу; б) аналізу прыкладаў, якія ілюструюць выкарыстанне тэорыі на практыцы; в) трэніроўкі з мэтай выпрацоўкі практычных навыкаў.

У час замацавання матэрыялу шырока практыкуецца самастойная работа вучняў. Пры гэтым вельмі важна, каб практычныя заданні выконваліся школьнікамі не механічна, а з засяроджаннем увагі. Трэба дабівацца, каб у практычную працу дзеці ўносілі элементы самастойнасці, а дзе магчыма, то і творчасць [2, 95–96].

Асноўная мэта самастойнай работы вучняў – навучыць дзяцей разважаць, аналізаваць і абагульняць моўныя факты, што ў сваю чаргу станоўча сказваецца на замацаванні вучэбнага матэрыялу, у тым ліку і арфаграфіі. У гэтых мэтах вельмі карысна практыкаваць заданні наступнага тыпу: “Растлумач”, “Дакажы”, ставіць пытанне “Чаму?”, патрабаваць абгрунтавання таго ці іншага напісання.

З першых дзен знаходжання ў школе неабходна выпрацоўваць у іх навыкі самастойнай работы. З гэтай мэтай практыкуюцца розныя віды заданняў. Напрыклад, спісванне з падкрэсліваннем вывучаных арфаграм, работа з дэфармаваным тэкстам (дзеці складаюць сказы са слоў, якія

напісаны не па парадку); развіццё сказаў з дапамогай пытанняў (даецца сказ і пытанні да яго).

Вялікае месца ў выкладанні беларускай мовы ў апошні час займаюць творчыя самастойныя працы. Работы творчага характару павышаюць цікавасць дзяцей да навучання, развіваюць іх назіральнасць, вучаць самастойна вырашаць пастаўленыя задачы. Важна і тое, што ў творчых пісьмовых работах праяўляюцца індывідуальныя якасці вучняў і асаблівасці іх мовы.

Заслугоўвае ўвагі такі від самастойнай работы па замацаванні арфаграфічных навыкаў вучняў, як дыктант з элементамі творчасці. Сутнасць яго ў тым, што дзеці запісваюць дыктуемы настаўнікам тэкст, дапаўняючы сказы словамі з прапануемымі арфаграмамі.

Карысным відам самастойнай працы з'яўляецца і складанне вучнямі арфаграфічных табліц, аналагічных прыведзеным у падручніку. Спачатку табліца складаецца калектыўна пад кіраўніцтвам настаўніка, а потым вучням прапаноўваецца скласці яе самастойна.

Вядома, што навыкі пісьма школьнікі могуць атрымаць з дапамогай сістэматычных пісьмовых практыкаванняў на базе засвоеных правіл арфаграфіі. Адным з эфектыўных відаў практыкаванняў з'яўляецца пісьмовы арфаграфічны разбор ці дыктант з абгрунтаваннем. На жаль, гэтым відам дзейнасці ў школе не надаецца асаблівай увагі. У школе часта прапануюць дзецям самастойную работу з апорнымі словамі, сачыненні-мініяцюры па малюнку, сачыненне на зададзеную настаўнікам тэму, сачыненне па прыказцы, па назіраннях, сачыненне па пачатку.

На заключных уроках для сістэматызацыі і абагульнення ведаў па граматыка-арфаграфічных тэмах вучні складаюць практыкаванні і заданні самастойна. Узорамі могуць быць практыкаванні з падручніка.

Напрыклад, пазнаеміўшыся з правапісам прыставак аб-, над-, пад-, перад-, прад-, вучні трэцяга класа складаюць заданні, у якія ўключаюць словы з гэтымі прыстаўкамі. Вучань выконвае практыкаванне, якое склаў яго сябр, а сваё заданне перадае наступнаму вучню. Такая самастойная праца з элементамі творчасці актывізуе разумовую дзейнасць школьнкаў, выпрацоўвае навыкі выкарыстання тэорыі на практыцы.

Каб сэканоміць час на ўроках, засяродзіць увагу вучняў на вывучанай арфаграме і тым самым замацаваць матэрыял, можна прапанаваць выбарачнае спісванне, калі тэкст практыкавання выконваецца на ўвесь, а выбарачны, па прапанове настаўніка. Заданні на выбарачнае спісванне можна прапанаваць пры вывучэнні любой тэмы па арфаграфіі.

Для развіцця ў дзяцей увагі можна выкарыстоўваць свабоднае спісванне. Спачатку тэкст практыкавання аналізуецца, разбіраюцца цяжкія арфаграмы, потым вучні чытаюць асобныя абзацы і ўвесь тэкст вучні

самастойна запісваюць сваімі словамі ці блізка да тэксту. Пасля выкананай працы вучні звяраюць свае запісы з тэкстам падручніка і выпраўляюць арфаграфічныя памылкі. Матэрыял для свабоднага спісвання павінен быць цікавым і зразумелы для вучняў.

Апісаныя вышэй практыкаванні выконваюць дзеці на ўрокау пад кіраўніцтвам настаўніка. Пры гэтым ступень самастойнасці вучняў увесь час узрастае.

Калі ж дзеці замацоўваюць матэрыял дасканала і авалодваюць “тэхнікай” выканання прапанаванага віду работы, аналагічныя заданні прапануюцца вучням для дамашняга задання.

Вельмі эфектыўнай формай замацавання арфаграфічных навыкаў, як вядома, з’яўляецца заданні на складанне сказаў. У класе такія заданні практыкуюцца ўвесь час. Неабходна прывучыць школьнікаў у працэсе працы звяртацца да даведачнай літаратуры, што садзейнічае лепшаму запамінанню матэрыялу, больш эфектыўнаму замацаванню ведаў.

Спіс літаратуры

1. Хакунова, Ф.П. Особенности организацыи самостоятельной работы обучаемых / Ф.П. Хакунова // Начальная школа. – 2003. – №1. – С. 70–75.

2. Ясакова, Л.В. Самостоятельная работа учащихся при закреплении материала на уроках русского языка / Л.В. Ясакова // Начальная школа. – 2002. – №6. – С. 73–77.